Аляксандар Вашчанка
«Настаўніцкая газета» 4 мая 2006

# РАЗГУЛЯЎСЯ ЮР'ЕЎ КОНЬ!



24 красавіка а 16-й гадзіне наведвальнікі дзіцячага парка імя Горкага былі ўзрушаны незвычайна маляўнічым відовішчам: па цэнтральнай алеі рухаўся гурт дзяўчат і хлопцаў у нацыянальных беларускіх строях. Дайшоўшы да кола агляду, яны раздзяліліся на тры групы і размясціліся на бліжэйшых пагорках. З самай высокай кропкі магутным зубрыным рыкам прараўлі трохмятровыя драўляныя трубы. На гэты рык адказала дуда, чапляючы нервы сваім заварожвальным гукам. Скрыпка ўпляла сваё сапрана ў старажытны матыў. Адвечным пульсам жыцця забухаў бубен. Загучалі спевы, і пачалося свята...

Даўняе свята Юр'я прысвечана апекуну жывёлы і земляробства, жаўнераў і гаспадара ваўкоў. Гэты хрысціянскі святы замяніў Ярылу, сына Лады і Дажбога (сонца), абаронца ўрадлівасці і кахання. Многімі сваімі рысамі ён нагадвае старажытнага апекуна хатняй жывёлы Вялеса — аднаго з галоўных багоў беларускага язычніцкага пантэона. Юрый ехаў на белым кані, адмыкаў зямлю ключамі, выпускаў расу і вясну, замыкаў пашчы ваўкам, каб яны не нападалі на скаціну.

*А ўзяў ён ключы залатыя,*
*Адамкнуў зямлю сыруценькую,*
*Пусціў расу цяплюсенькую*
*На Белую Русь і на ўвесь свет.*
(Віцебская губерня; Шпілеўскі,1856 г.)

Тым часам, свята раскручвала сваё магічнае кола, збіраючы новых гледачоў. Дзяўчынкі з узорнага фальклорнага ансамбля «Калыханка» Міханавіцкага Дома фальклору (кір. Л.М.Рыжкова) сваімі высокімі медытатыўнымі галасамі пранізвалі прастору парка. У адказ ім з другога пагорка спявалі мінскія «Талака» і «Верас» (кір. Т.Пладунова). Рэхам адказвала «Вяснянка» з вёскі Чурылавічы (кір. С.Жук). Шпакі зляцеліся на галасы, расселіся на бліжэйшых соснах і, як вялікія пераймальнікі, пачалі падпяваць. Праскакалі два коннікі, у магічным дзеянні аб'язджаючы поле, на якое дзеля просьбы аб урадлівасці

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

зямлі-маці быў вынесены каравай з запаленымі свечкамі. Недзе недалёка тарахцеў трактар, шум атракцыенаў дысанансам уплятаўся ў чароўнае дзейства, якое машынай часу перанесла нас у далёкае мінулае, паказваючы, як шанавалі і абагаўлялі прыроду нашы продкі.



Гэтае фальклорнае свята зладзілі для нас дацэнт БДУ культуры і мастацтваў Вячаслаў Калацэй і кіраўнік курса «Этнафоназнаўства» гэтага ж універсітэта Таццяна Пладунова разам са сваімі аднадумцамі і паплечнікамі. Яны паказалі, што абрадавыя спевы ўяўлялі сабой спецыфічны від, у гэтым выпадку, сакральнай камунікацыі, якія здзяйсняліся па прынцыпе «выклік — адказ» і служылі сродкам эмацыянальнага інфармавання аб нейкай незвычайнай, жыццёва абвостранай сітуацыі традыцыйнай абшчыны (канцэпцыя Тойнбі).

Як правільна правесці фальклорнае свята? Існуюць розныя падыходы і пункты гледжання. У этнашколе (кіраўнік праекта І.І.Сучкоў) свята праходзіць у форме адукацыйна-выхаваўчага модуля, дзе адно з галоўных месцаў займае тлумачэнне самога дзейства. Гэты модуль звычайна праводзіцца ў актавай зале і не заўсёды супадае па часе з земляробчым календаром беларусаў. Значыць, парушаецца функцыянальна-рэгулятыўная прымеркаванасць этнакультуры. У Калацэя з Пладуновай атрымаўся амаль ідэальны варыянт правядзення абрадавага свята. Чаму амаль? Таму што, калі б усе гледачы былі ўцягнуты ў свята, атрымалася б сінкрэтычнае дзейства злітнасці ўсіх відаў мастацтва. Дарэчы, мне здаецца, што абрад адрозніваецца ад свята тым, што ў любым абрадзе на першае месца заўсёды выходзіць магічная функцыя, а фальклорнае свята — гэта эстэтычная, напоўненая песнямі, танцамі, гульнямі, карагодамі, музыкай дзея, мэта якой увесці ў пэўны стан душы ўдзельнікаў і гледачоў.

Вельмі сімвалічна, што свята Юр'я адбылося побач з колам агляду, якое сваім несупынным рухам нагадала аб імклівасці часу і аб тым, што сучаснае жыццё немагчыма вярнуць у традыцыйнае кола свят земляробчага каляндара беларусаў. Для чаго праводзіць падобныя мерапрыемствы? Ці для ўсіх яны зразумелыя? Вядома, не для ўсіх. Я назіраў за гледачамі. Некаторыя маладыя людзі, глытаючы піва, раўнадушна праходзілі міма. Але большасць спынялася, распытвала дасведчаных аб свяце. Многіх цікавіла беларуская валынка — дуда. Доктар філасофскіх навук Уладзімір Міхайлавіч Конан, усеўшыся на першую зялёную траўку, з невыказнай асалодай слухаў юр'еўскія песні,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гульні і карагоды. Але ж нездарма кажуць, што духоўная эліта ў адказе за духоўны ідэал, які яна выхоўвае. Таму, каб не парушаліся адвечныя законы прыродна-касмічнага і сацыяльна-культурнага суладдзя, мы павінны ведаць духоўную спадчыну свайго народа і перадаваць яе сваім дзецям. Тады не перарвецца жывая сувязь пакаленняў. І толькі тады чалавек зможа жыць у поўнай гармоніі з Прыродай і сваёй Душой.



РЕПОЗИТОРИЙ ... КИ